## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

# СЦЯПАН СЦЯПАНАВІЧ ЛАЎШУК
## (Да 70-годдзя з дня нараджэння)



Жыццё няўмольна рухаецца наперад, ствараючы паслядоўныя часавыя засечкі ў няспынным кругазвароце існавання чалавека, грамадства, краіны. Рунічнае пляценне гэтых засечак шмат у чым і стварае своеасаблівы сімвалічны культурна-духоўны код кожнай нацыі.

Сёлета навуковая і тэатральная грамадскасць Беларусі адзначыць чарговы юбілей вядомага даследчыка айчыннай літаратуразнаўчай, драматургічнай навукі доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Сцяпана Сцяпанавіча Лаўшука.

Амаль кожную творчую асобу ў любой галіне мастацкай, навуковай, вытворчай дзейнасці часцей за ўсё вызначае дамінуючая «одна, но пламенная страсть», служэнне якой становіцца для яе ўсёахопнай патрэбай, жаданнем, яе жыццёвым крэда. Менавіта яно, гэтае жаданне, і з'яўляецца той сілай, якая выводзіць дапытлівую творчую асобу за абсягі паўсядзённай ардынарнасці, становіцца крэатыўнай крыніцай сапраўднага чалавечага станаўлення, якая дазваляе яму ўбачыць акаляючы свет у новым, яшчэ раней нікому нябачным ракурсе.

Напэўна, мы не памылімся, калі адзначым, што такім пачуццём-захапленнем-жаданнем для Сцяпана Сцяпанавіча Лаўшука з'явілася любоў да тэатра, а адсюль і да драматургіі. З маленства адчуўшы ў сабе шчымлівае пачуццё захаплення сцэнічнай імправізацыяй, пачынаючы ад школьнай, затым студэнцкай самадзейнасці, якія давалі яму вялікую асалоду спасціжэння цуду пазарампавага пераўвасаблення, назаўсёды прывілі ў ім няўтольную цікавасць да складанага свету драматургічнага мастацтва.

Гэтую няўрымслівую прыхільнасць да тэатра і драматургіі вучоны і нясе праз усё жыццё. Паказальна, што і ў штодзённым побыце ён з'ўляецца чалавекам у значнай меры арганічна-артыстычным, які прыўносіць у нашу руцінную навуковую працу пэўныя элементы незвычайнасці, радаснасці, святочнасці.

Праца па даследаванню драматургічных жанраў толькі на першы погляд падаецца быццам звычаёва-простай, аднак у сапраўднасці яна вельмі спецыфічная і складаная. Авалодаць ёю з наскоку, паскорана і хуткасна, нельга. Яна патрабуе поўнай жыццёвай аддачы.

Дзеля пранікнення ў яе фундаментальную сутнасць патрэбны і вялікая ўнутрана-духоўная зацікаўленасць, і вельмі шырокая інтэлектуальна-эстэтычная падрыхтаванасць, і валоданне глыбокім тэарэтычным інструментарыем мастацкага даследавання. Іншымі словамі – быць надзеленым асаблівым дарам бачання «мізансцэны» драматычна-тэатральнага цудадзейства. Можа, па гэтай прычыне сур'ёзных спецыялістаў у галіне даследавання драматургіі не так ужо і шмат. У нашай краіне сярод іх, бясспрэчна, адно з першых месцаў займае імя С. С. Лаўшука.

Нарадзіўся Сцяпан Сцяпанавіч у невялікім усходнепалескім гарадку Васілевічы 28 ліпеня 1944 года ў сям'і чыгуначніка. У 1961 годзе скончыў Васілевіцкую сярэднюю школу № 2. У 1962–1967 гг. вучыўся на філалагічным факультэце БДУ. У студэнцкія гады ўдзельнічаў у асваенні цалінных зямель, займаўся спортам, браў удзел у рабоце навуковых гурткоў.

Пасля заканчэння ўніверсітэта настаўнічаў у Лунінецкім раёне, працаваў у РК ЛКСМБ і дырэктарам Бродніцкай НСШ.

Але ўнутранае жаданне да творчай самарэалізацыі ўзяло верх – у 1970 годзе Сцяпан Сцяпанавіч паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Пасля яе заканчэння абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Сучасная беларуская драматургія: праблемы канфлікту і характару» (1974).

У канцы 1973 года С. С. Лаўшук залічаны ў штат Інстытута літаратуры АН БССР. Спачатку працуе малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам, затым загадчыкам аддзела, намеснікам дырэктара па навуковай частцы. На сённяшні дзень ён займае пасаду галоўнага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. І ўвесь гэты час вучоны прытрымліваўся прынцыпу: ні дня без радка.

Засярodзіўшыся на даследаванні праблемных пытанняў развіцця драматургічных жанраў, С. С. Лаўшук змог увесці ў кола свайго даследчага дыскурсу амаль увесь «залаты» фонд нашай нацыянальнай драматургіі, пачынаючы з п'ес Каятана Марашэўскага і заканчваючы сучаснымі драматургамі. У кола яго асаблівых інтарэсаў трапіла дзейнасць такіх карыфеяў нашага сцэнічнага пісьменства ХХ стагоддзя, як У. Галубок, Ф. Аляхновіч, Я. Купала, М. Гарэцкі, В. Шашалевіч, К. Крапіва, А. Макаёнак, А. Дудараў і інш.

Таленавіты даследчык, бліскучы аналітык Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук зрабіў вялікі ўклад у станаўленне і развіццё айчыннай драматургічна-літаратуразнаўчай навукі, распрацаваўшы многія тэарэтычна-фундаментальныя асновы і палажэнні гэтай літаратуразнаўчай дысцыпліны. Увёў ва ўжытак, сярод іншага, найбольш на сёння аўтарытэтную, навукова-пераканаўчую храналагічную перыядызацыю развіцця беларускай драматургіі.

Манаграфіі і артыкулы нашага юбіляра заўсёды прыцягваюць увагу чытачоў і спецыялістаў-навукоўцаў глыбінёй прапрацоўкі тэмы, выразнасцю адстойваемай пазіцыі, яснасцю і пераканаўчасцю выказвання.

У 1998 годзе ім была паспяхова абаронена доктарская дысертацыя па тэме: «Беларуская драматургія ХХ стагоддзя: асноўныя праблемы развіцця». Гэта была, дарэчы, першая абарона доктарскай дысертацыі ў айчыннай Акадэміі навук пасля таго, як яна атрымала статус нацыянальнай.

У тым жа 1998 годзе ВАКам яму было прысвоена ганаровае званне прафесара, а ў 2004 годзе ён быў абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі.

Наогул друкавацца даследчык пачаў у 1962 годзе, з 1972 года стала выступаў з літаратурна-навуковымі артыкуламі. Ім напісана звыш 280 навуковых артыкулаў, выдадзены шэраг навуковых манаграфій, сярод якіх: «Сучасная беларуская драматургія» (1977), «Станаўленне беларускай савецкай драматургіі» (1984), «Кандрат Крапіва і беларуская драматургія» (1986, 2002), «На драматургічных скрыжаваннях» (1989), «Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці» (1978, у сааўтарстве), «У. І. Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў беларускай літаратуры» (1987, у сааўтарстве), «На парозе 90-х» ( 1993, у сааўтарстве), «З думкай пра сучасніка» (1977), «Першы народны артыст БССР» (1982), «Высокія арбіты грамадзянскасці» (1984). Ён сааўтар «Истории белорусской советской литературы» (1977), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1, 1981; т. 2, 1982); «Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей» (т. 2, 1994; т. 3, 1994; т. 4, 1995); «Гісторыі беларускай літаратуры» (1999), «Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя» ў 4 тамах, 6 кнігах (т. 1–4, 1999–2014), у падрыхтоўку якой юбіляр зрабіў вельмі вялікі ўклад.

Не лішне будзе нагадаць, што такога літаратуразнаўчага выдання, як «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя» ў 4 тамах, 6 кнігах, не змаглі пакуль напісаць даследчыкі іншых краін былога СССР.

У 2010 годзе пабачыла свет чарговая манаграфічная праца вядомага літаратуразнаўцы пад назвай «Гарызонты беларускай драматургіі», у якой абагульнены творчы вопыт беларускай драматургіі ад яе вытокаў і да нашых дзён.

Побач з навукова-даследчай дзейнасцю Сцяпан Сцяпанавіч выдатна праявіў сябе і на ніве тэксталагічнай працы. Ім асабіста была ажыццёўлена падрыхтоўка такіх выданняў, як «Творы» Уладзіслава Галубка» (1983), «Збор твораў Кандрата Крапівы» (т. 1–6, 1997–2004), «Збор твораў А. Макаёнка» (т. 1–5, 1987–1990); зборнікаў «Беларуская дакастрычніцкая драматургія» (1978), «П'есы» (1984), «Вершы, байкі, эпіграмы і паэмы» (1991), «Цудоўная дудка» (1997), «Хлопчык у лесе» (1992) і інш.

Зараз вучоны ўзначальвае рабочую навуковую групу, якая працуе над выданнем Збору твораў у 10 тамах народнага пісьменніка Беларусі І. Я. Навуменкі. Свет пабачылі ўжо тры тамы гэтага выдання.

Вялікі ўклад зрабіў С. С. Лаўшук у справу падрыхтоўкі навуковых кадраў. Шмат гадоў ён з'яўляўся намеснікам старшыні экспертнага савета № 7 ВАК Беларусі, членам савета па абароне дысертацый у Інстытуце літаратуры. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам абаронена каля паўтара дзясятка кандыдацкіх дысертацый.

Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук з'яўляецца членам Саюза беларускіх пісьменнікаў, Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў, Старшынёй беларускага аддзялення Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры і многіх іншых грамадскіх арганізацый.

Асабліва трэба адзначыць тое, што не можа па-чалавечы і па-грамадзянску не імпанаваць у любым чалавеку мне асабіста. Так, будучы абраным кіраўніком партыйнай камуністычнай арганізацыі Акадэміі навук БССР яшчэ ў далёкім 1990 годзе, ён з гонарам і вытрымкай да сённяшняга часу застаецца, нягледзячы на ўсе складаныя перыпетыі нашага жыцця ў апошнія 20 год, нязменным кіраўніком гэтай арганізацыі ўжо ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь, падаючы прыклад сумленнага і прынцыповага служэння аднойчы выбраным ідэалам і праўдзе жыцця.

За шматгадовую навуковую і грамадскую дзейнасць у 2004 годзе Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук стаў кавалерам адной з вышэйшых дзяржаўных узнагарод – ордэна Францыска Скарыны, узнагароджаны знакам «Выдатнік друку Беларусі», многімі памятнымі медалямі.

Свой юбілей наш калега і сябар сустракае ў звычайных навуковых і жыццёвых клопатах. І праблемы беларускага літаратуразнаўства застаюцца для яго крыніцай новых творчых натхненняў і здзяйсненняў. Вучні і калегі-аднадумцы жадаюць яму моцнага здароўя і аптымізму дзеля ўзыходжання на новыя эверэсты інтэлектуальна-мастацкіх здзяйсненняў.

*І. М. Шаладонаў*